**«Агульнае бачанне для лепшага свету»**
Стандарты для дасягнення Мэт устойлівага развіцця (МУР)

МУР 3 – Забеспячэнне здаровага ладу жыцця і садзейнічанне дабрабыту для ўсіх у любым узросце

*Пасланне да Сусветнага дня стандартызацыі – 2023*

Доступ да якаснай аховы здароўя з'яўляецца правам чалавека і неабходны для ўстойлівага развіцця. Мэта МУР 3 – забеспячэнне здаровага ладу жыцця і садзейнічанне дабрабыту для ўсіх у любым узросце.

Міжнародныя стандарты і ацэнка адпаведнасці іграюць вырашальную ролю ў дасягненні гэтай мэты. Яны даюць глабальную аснову для ўкаранення лічбавых тэхналогій у ахове здароўя, даследаванняў і распрацовак, вытворчасці і абслугоўвання ўстройстваў і сістэм у сферы аховы здароўя, забяспечваючы даступнасць эфектыўных, бяспечных і надзейных медыцынскіх устройстваў, паслуг і сістэм для шырокіх слаёў насельніцтва.

Яны таксама забяспечваюць магчымасць распрацоўкі эфектыўнай палітыкі і рэгулявання, якія заахвочваюць супрацоўніцтва для дасягнення лепшых вынікаў у ахове здароўя.

Па меры развіцця лічбавых тэхналогій у ахове здароўя стандарты IEC, ISO і ITU дапамагаюць гарантаваць бяспеку сістэм і абарону канфідэнцыяльнасці пацыентаў.

Мы працуем разам над паскарэннем рэалізацыі Парадку дня ў галіне ўстойлівага развіцця на перыяд да 2030 года, выкарыстоўваючы стандарты для дасягнення МУР і наша «Агульнае бачанне для лепшага свету».

**Джо КОПС,** Прэзідэнт IEC
**Ульрыка ФРАНКЕ,** Прэзідэнт ISO
**Сэйдзо ОНОЭ,** Дырэктар ITU